# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 4 (196) 24 лютага 1993 года, серада*



## Заняткі ў дысплейным класе

У апошні час ва універсітэце многае робіцца па набыццю і ўкараненню новай тэхнікі. Створана некалькі камп ́ютарных класаў, дзе са студэнтамі вядуць заняткі вопытныя выкладчыкі і спецыялісты вылічальнага цэнтра.

Гэты здымак зроблены ў дысплейным класе № 2 (аул. 227). Заняткі са студэнтамі праводзіць інжынер-праграміст, асістэнт кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі Алена Мікалаеўна Лівак.

**Фота У. САРОКІНА.**

# ЭКЗАМЕНЫ СТУКАЮЦЦА Ў ДЗВЕРЫ

Ва універсітэце пачалася падрыхтоўка да новага навучальнага года. Галоўная задача, якая стаіць перад нашым кіраўніцтвам,— забяспечыць якаснае папаўненне студэнцкай сям ́і. За кароткі час, які застаўся да ўступных экзаменаў, неабходна зацвердзіць план прыёму на першы курс, структуру прыёмных экзаменаў, склад прыёмнай і прадметных экзаменацыйных камісій.

Многія з гэтых пытанняў сталі тэмай размовы на першым пасяджэнні прыёмнай камісіі, якое адбылося 15 лютага. Вёў яго старшыня камісіі прафесар А. В. Бадакоў.

Прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт Я. А. Роўба пазнаёміў прысутных з планам прыёму, структурай уступных экзаменаў, іншымі важнымі пытаннямі падрыхтоўкі да гэтага важнага мерапрыемства.

На пасяджэнні прыёмнай камісіі зацверджаны план прыёму на дзённую і завочную формы навучання.

Улічваючы цікавасць да лічбаў прыёму па асобных дысцыплінах і факультэтах, мы вырашылі надрукаваць іх:

фізічны факультэт — 50 чалавек; філалагічны — 100 на дзённае і 25 на завочнае; факультэт беларускай філалогіі і культуры — 100 і 50; фізічнай культуры — 75 і 50; педагогікі і методыкі пачатковага навучання — 100 і 75; гістарычны — 65 і 25; біялагічны — 60 і 25; матэматычны — 100 і 25; інжынерны — 50 і 25 (вячэрняе аддзяленне); правазнаўства — 50 і 15; міжнародныя эканамічныя адносіны — 25 і 10.

**ПРАКАМЕНЦІРАВАЦЬ ПЛАН ПРЫЁМУ НА І КУРС 1993—1994 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА МЫ ПАПРАСІЛІ ПРАРЭКТАРА ПА ВУЧЭБНАЙ РАБОЦЕ ДАЦЭНТА Я. А. РОЎБУ.**

**— План прыёму застаўся такім, як і ў мінулым годзе, за выключэннем факультэта правазнаўства. План прыёму на гэты факультэт крыху знізіўся, бо, на нашу думку, забяспечанасць кадрамі прафесарска-выкладчыцкага складу, а таксама плошчай не дазваляюць арганізаваць якасную падрыхтоўку спецыялістаў у тых параметрах, што і ў мінулым годзе. Па-другое, вопыт мінулых гадоў паказвае, што прадпрыемствы, арганізацыі і нават асабіста грамадзяне заключаюць з універсітэтам дагаворы на падрыхтоўку на ўмовах частковай аплаты навучання звыш плана прыёму.**

**А цяпер па структуры ўступных экзаменаў. Змены адбыліся ў наступным. Па-першае, на факультэце правазнаўства медалісты будуць здаваць не адзін, а два экзамены, і абодва трэба вытрымаць на «выдатна». Чым гэта выклікана? Вялікім конкурсам. Ужо ў мінулым годзе некаторыя спецыяльнасці фарміраваліся амаль што з адных медалістаў. Кожны год колькасць медалістаў узрастае. Новыя правілы прыёму ў ВНУ дазваляюць вызначаць парадак іх залічэння самастойна. Гэтым правам і карысталася прыёмная камісія універсітэта. На астатнія спецыяльнасці змен не адбылося.**

**Па-другое, на філалагічныя спецыяльнасці павялічылася колькасць экзаменаў, уведзены экзамены па гісторыі і замежнай мове.**

**Мне здаецца, прычыны гэтых змен няцяжка зразумець, яны выкліканы тымі пераменамі, што адбыліся ў нашым жыцці. Пацвярджэннем гэтага з ́яўляецца і ўвядзенне экзамена па інфарматыцы і вылічальнай тэхніцы на матэматычным факультэце.**

**У заключэнне дадам, што ў пачатку сакавіка ў нашай газеце мы надрукуем поўны спіс уступных экзаменаў.**

# НАВІНЫ

## Прысвоены вучоныя званні

Атэстацыйная камісія прысвоіла вучонае званне дацэнта загадчыку вучэбна-метадычнага аддзела Э. С. Ярмусіку (па кафедры гісторыі Беларусі), І. А. Болдак (па кафедры замежных моў), Т .М. Ізосімавай (па кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі). Віншуем!

**Х. ВЕРБАВА,**
**сакратар Вучонай рады універсітэта.**

## Паслугі будуць пашырацца

На чарговым пасяджэнні рэктарата разгледжана пытанне аказання платных паслуг у адукацыйных і іншых відах камерцыйнай дзейнасці. Інфармацыю зрабіў прарэктар В. П. Таранцей. У бягучым годзе кола паслуг пашыраецца да 15—17 найменняў. Ішла таксама размова аб адкрыцці экстэрната па асобных спецыяльнасцях.

Абмеркаваны таксама ход падрыхтоўкі спецыялістаў на беларускай мове.

**К. ІВАНОЎСКІ.**

## Лекцыю чытае бізнесмен

Наш універсітэт у апошні час актыўна супрацоўнічае з замежнымі фірмамі, наладжвае кантакты з салідным бізнесменамі. Вось і нядаўна ў другі раз пабываў у нас прэзідэнт фірмы «Транспарт унд фертрыссервіз» з Германіі Экхарт Раабэ. Ён прапанаваў выступіць з некалькімі лекцыямі перад студэнтамі па праблемах развіцця малога бізнесу ў Заходняй Еўропе.

12 лютага адбылася першая лекцыя для студэнтаў І курса факультэта правазнаўства. Пан Раабэ расказаў пра эканамічныя і палітычныя праблемы Германіі, якія ўзніклі там пры аб ́яднанні.

У сувязі з адкрыццём у перспектыве факультэта міжнародных эканамічных адносін частымі гасцямі ў нас стануць замежныя камерсанты, фінансісты, эканамісты, прадпрымальнікі.

**П. МІХНЮК.**

## Факультэт змяніў адрас

Па новаму адрасу — Захарава, 32 трэба цяпер шукаць факультэт пачатковага навучання. Як вядома, у ранейшым будынку па вуліцы Дзяржынскага з-за цеснаты нельга было па-сапраўднаму арганізаваць навучальны працэс, аўдыторную падрыхтоўку студэнтаў.

І вось з другога семестра студэнты перасяліліся ў памяшканне былога тэхнікума фізічнай культуры, дзе зараз размяшчаецца таксама аднайменны факультэт універсітэта.

Як паведаміла рэдакцыі намеснік дэкана пачфака Р. Ц. Палубінская, умовы працы зараз значна палепшыліся. А ў старым будынку засталіся вучыцца трэццякурснікі, знаходзяцца некаторыя кафедры.

**П. ІВАНЕНКА.**

## Сустрэча была карыснай

Як вядома, у нашым універсітэце больш як 700 чалавек займаюцца зараз за плату. Кошт навучання ў сувязі з інфляцыяй, на жаль, даводзіцца павялічваць. Менавіта гэтай праблеме і была прысвечана сустрэча прарэктара па міжнародных сувязях і камерцыйнай рабоце В. П. Таранцея і дэкана факультэта правазнаўства І. В. Гушчына са студэнтамі, якія вучацца на дагаворнай падставе,— першакурснікамі і завочнікамі. Размова ішла пра сутнасць даплат, якія трэба будзе зрабіць, пра палажэнні дагавораў, што заключаюцца са студэнтамі.

Сустрэча была карыснай для абодвух бакоў, студэнты з разуменнем аднесліся да прадпрынятых фінансавых мер.

**В. ПЯТРОЎ.**

## Аргкамітэт вызначыў задачы

Як вядома, у красавіку ў рамках тыдня Навукі будзе праходзіць навукова-практычная канферэнцыя выкладчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў на тэму «Праблемы інтэнсіфікацыі навучання студэнтаў універсітэта». У вучэбна-метадычны аддзел паступіла 110 заявак на ўдзел у гэтым мерапрыемстве, здадзены тэзісы дакладаў для выдання іх асобным зборнікам.

15 лютага адбылося пасяджэнне аргкамітэта па правядзенню канферэнцыі, якое вёў яго старшыня прафесар В. П. Таранцей. Створаны секцыі па наступных праблемах: метадалагічныя і тэарэтычныя асновы ўдасканалення вучэбнага працэсу; праблемы арганізацыі практыкі студэнтаў; гуманітарызацыя працэсу навучання студэнтаў; інтэнсіўныя метады навучання і іх роля ў практыцы будучых спецыялістаў; камп ́ютарызацыя і выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання ў працэсе вучобы студэнтаў. Вызначаны меры па якаснай падрыхтоўцы і правядзенню Дня навукі.

**Я. КАНДРАТОВІЧ,**
**метадыст вучэбна-метадычнага аддзела.**

## Слаўнаму сыну беларускага народа

Грамадскасць рэспублікі з пачуццём гонару за свайго слаўнага сына адзначыла 13 лютага 75-ю гадавіну з дня нараджэння Пятра Міронавіча Машэрава. Гэты чалавек пакінуў значны след у памяці кожнага беларуса. Знаходзячыся на працягу многіх гадоў на чале рэспублікі, Пётр Міронавіч шмат зрабіў для росквіту яе эканомікі, культуры, народнай асветы. Для яго заўсёды галоўнай фігурай у жыцці з ́яўляўся рабочы чалавек, сумленны працаўнік.

З нагоды 75-годдзя П. М. Машэрава ў зале факультэта будынка беларускай філалогіі і культуры адбыўся вечар памяці. З успамінамі аб выдатным дзеячы нашай дзяржавы, нацыянальным героі Беларусі выступілі тыя, хто добра ведаў яго, працаваў пад яго кіраўніцтвам.

**К. МІХАЙЛАЎ.**

# ЯКАЯ ГІСТОРЫЯ НАМ ПАТРЭБНА?

## Нататкі з Усебеларускага кангрэса гісторыкаў

3—5 лютага бягучага года ў Мінску працаваў Усебеларускі кангрэс гісторыкаў. Пачынаў ён сваю работу як канферэнцыя, а завяршыўся кангрэсам. Такога прадстаўнічага форуму гісторыкі рэспублікі не ведалі з 1960 года. У рабоце кангрэса прынялі ўдзел вучоныя з навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў Беларусі, ВНУ, выкладчыкі гісторыі з тэхнікумаў, вучылішчаў, агульнаадукацыйных школ, аспіранты, шматлікія госці з блізкага і далёкага замежжа, усяго 340 чалавек.

Кангрэс працаваў на базе гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, Міністэрства замежных спраў Беларусі і навукова-даследчага цэнтра дакументацыі і рэтраінфармацыі. Праведзены два пленарныя пасяджэнні, круглы стол, плённа працавалі 10 секцый. Увесь ход кангрэса аб´ядноўваўся тэмай «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы)». Калі падсумаваць і абагульніць думкі ўдзельнікаў кангрэсу ў адносінах гістарычнай навукі, то яны прышлі да высновы, што суверэннай беларускай дзяржаве патрэбна свая, самастойная, ні ад каго не залежная навуковая гісторыя. Бо так ужо склалася, што гісторыя беларускага народа за невялікім выключэннем ніколі не пісалася з вольных, самастойных пазіцый. На працягу апошніх стагоддзяў спачатку польская, затым расійская і савецкая гістарыяграфіі, закранаючы гісторыю Беларусі, асвятлялі яе кожная ў сваім накірунку, з улікам сваіх інтарэсаў.

Аб´ектыўна адлюстраваць гістарычнае мінулае і сучаснасць можна толькі пры сумленных падыходах і ацэнках даследчыкаў, іх незалежнасці ад зададзенай ідэалогіі, уціску палітычных партый, рухаў ці арганізацый, ад кан´юнктурных меркаванняў. Таму настала пара адмовіцца ад выкарыстання ў якасці метадалагічнай асновы толькі марксізма-ленінізма, асабліва тых яго палажэнняў, якія адвергнуты жыццём (класавы падыход, аднапартыйнасць, дыктатура пралетарыяту і інш.), ды і ад рашэнняў партыйных і савецкіх органаў розных узроўняў, а абапірацца і на іншыя тэарэтычныя плыні, у тым ліку і на тыя, што ў свой час супрацьстаялі ім, больш шырока выкарыстоўваюць тэарэтычную думку на Беларусі — філасофскую, рэлігійную, атэістычную і іншую. Крытэрыем такіх крытычных адносін можа быць параўнанне тэарэтычна-практычных падыходаў з жыццём, гістарычным вопытам, якія мы цяпер ведаем значна лепш, чым раней.

Сучасны стан гістарычнай навукі на Беларусі патрабуе, не забываючыся пра нядрэнна распрацаваныя сацыяльна-эканамічныя праблемы, большую ўвагу надаваць палітычнай гісторыі, даследаваць у ёй недаследаванае па розных палітычных абставінах, не зніжаючы ўвагі да гісторыі беларускага народа ў найноўшы час (савецкі перыяд), дзе таксама многае трэба пераасэнсаваць і нават напісаць занава, больш сіл сканцэнтраваць на дасавецкай гісторыі. Іменна ў ёй навуковыя даследаванні штучна звужаліся і засталося шмат праблем і тэм, якія зусім не асветлены ці падаваліся з пазіцый афіцыйнай польскай, расійскай і савецкай гістарыяграфіі. Гэта дапаможа зрабіць нашу гісторыю больш поўнай і аб´ектыўнай.

Для вырашэння названых і іншых праблем неабходна глыбей і шырэй паглядзець на гістарычны працэс, улічыць геапалітычнае становішча Беларусі і ролю геапалітычнага фактару, спалучыць фармацыйны, цывілізацыйны і культуралагічны падыходы, што дасць магчымасць прасочваць з´явы сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага парадку. На вялікіх адрэзках часу больш грунтоўна і дакладна дазволіць разгледзець гісторыю беларускага народа ў кантэксце славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый, паказаць яго ўздзеянне на іх культуру, уклад у яе. Толькі нацыянальнымі межамі абмяжоўвацца проста немагчыма, бо любая навука, у тым ліку гістарычная, па прыродзе і характару міжнародная, інтэрнацыянальная.

Вядома, што навуковая канцэпцыя гісторыі Беларусі не можа не зыходзіць з нацыянальных пазіцый беларускага народа, патрыятычных адносін да сваёй Бацькаўшчыны. Гістарычныя даследаванні беларускіх навукоўцаў і краязнаўцаў павінны быць прасякнуты пачуццём нацыянальнай годнасці, адказных адносін да нашай мінуўшчыны. Гістарычная свядомасць можа і павінна стаць неад´емнай рысай менталітэту беларускага народа, які шырока прызнаны і высока ацэнены ў свеце.

Натуральна, што нельга абыйсціся без пошуку і выкарыстання новых дакументаў па ўсіх перыядах гістарычнага развіцця нашага народа, без пераасэнсавання раней выкарыстаных у навукова-даследчым працэсе, больш крытычнай ацэнкі ўсёй дакументальнай базы, уведзенай у навуковае абарачэнне ў савецкіх выданнях. Неабходна перастаць ігнараваць беларускую дыяспару, неад´емную частку беларускага народа, уключыць яе ў нашу гісторыю.

Неабходна і распрацоўка новых метадаў гістарычных даследаванняў, прымяненне ў працы гісторыкаў статыстыка-матэматычных падыходаў і магчымасцей камп´ютарнай тэхнікі, не выключаючы, вядома, і традыцыйных метадаў (гістарызму, параўнальнага аналізу, рэтраспектыўнага, структурна-сістэмнага і інш.).

Рэалізацыя гэтых падыходаў і накірункаў да стварэння нацыянальнай навуковай школы і выпрацоўкі навуковай канцэпцыі гісторыі Беларусі, іх дапаўненне, паглыбленне і пашырэнне дазволіць стварыць працы, якія змогуць адлюстраваць самабытную, непаўторную, багатую, гераічную і трагічную гісторыю беларускага народа.

Што тычыцца гістарычнай адукацыі, то абмеркаванне яе праблем праходзіла ў секцыі «Метадалагічныя праблемы гісторыі і методыкі выкладання гістарычных дысцыплін», а таксама ў секцыях, дзе абмяркоўваліся пытанні развіцця навукі па гісторыі Расіі і ўсеагульнай гісторыі, на радзе іншых секцый. Дыскусіі былі вельмі вострымі, але да згоды прыйшлі ў наступным:

а) Трэба неадкладна дапрацаваць канцэпцыю нацыянальнай гістарычнай адукацыі для сярэдняй школы і распрацаваць яе для вышэйшай школы Беларусі. Распрацоўка апошняй толькі пачынаецца. А гэтая праца ўзаемасувязная і ўзаемазалежная. Прытым, калі мы хачам падняцца да сусветнага ўзроўню, то ў канцэпцыі нацыянальнай адукацыі па гісторыі павінен улічвацца вопыт вядучых краін Еўропы, Азіі, Амерыкі.

б) Распрацаваць навучальныя планы і праграмы па курсу гісторыі Беларусі для агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школ. Такая работа ўжо ідзе, але ідзе марудна, яе трэба як мага хутчэй фарсіраваць, аб´яднаўшы намаганні вучоных-акадэмістаў і вядучых ВНУ рэспублікі, іх гістарычных факультэтаў і кафедр.

в) Выданне падручнікаў па гісторыі Беларусі для гістарычнага і няпрофільных факультэтаў, па гісторыі Расіі, усеагульнай гісторыі, дапаможных гістарычных дысцыплін. Вырашана актывізаваць працу ўжо створаных аўтарскіх калектываў па падрыхтоўцы рукапісаў падручнікаў і стварыць новыя аўтарскія калектывы з лепшых спецыялістаў-гісторыкаў і метадыстаў.

г) Перавыдаць хрэстаматыі і зборнікі дакументаў па гісторыі, пазбавіўшы іх у першую чаргу ад класавага падыходу і партыйна-палітычнай арыентаванасці былых аўтараў пры падборцы дакументаў і іх трактоўцы. Тут можна абысціся выпраўленнем і дапаўненнем, а таму пара прыступіць да працы неадкладна, паклаўшы ў яе аснову толькі навуку.

д) У сціслыя тэрміны распрацаваць сіламі гістарычных кафедр і выдаць для ўнутрывузаўскага карыстання студэнтамі, выкладчыкамі (настаўнікамі школ) тэксты лекцый па гісторыі, у першую чаргу гісторыі Беларусі. Такая праца ў многіх ВНУ ужо пачалася і яе трэба паскорыць. І тут паўстае пытанне аб неабходнасці гісторыкам рэспублікі хутчэй прыйсці да паразумення па пытаннях аб перыядызацыі развіцця чалавечага грамадства на Беларусі. Без гэтага практычна немагчыма распрацаваць ні навуковую канцэпцыю гістарычнай адукацыі, ні навучальныя планы і праграмы, ні выданне і перавыданне навучальна-метадычнай і навукова-метадычнай літаратуры па гісторыі для студэнтаў усіх форм навучання з улікам новай цывілізацыйна-фармацыйнай яе перыядызацыі (пажадана па курсах і гістарычных перыядах, улічваючы магчымасці і правы выдавецтваў ВНУ).

е) Абмяняцца праграмамі па спецкурсах і спецсемінарах паміж асобнымі кафедрамі і гістарычнымі факультэтамі ВНУ рэспублікі.

ж) Смялей уключаць у навучальны працэс, звязаны з выкладаннем курсаў гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін, ТСН, у першую чаргу камп´ютар. Увядзенне ў навучальныя планы гістарычных факультэтаў курса гістарычнай інфарматыкі не толькі дазволіць рэзка інтэнсіфіцыраваць навучальны працэс, пазбавіць выкладчыкаў гісторыі вышэйшых навучальных устаноў (школ, гімназій, ліцэяў, педвучылішчаў, ПТВ, тэхнікумаў) ад руціннай працы, аблегчыць засваенне студэнтамі новай гістарычнай тэрміналогіі, кантроль за іх ведамі, умацуе самі веды студэнтаў па прадмету. Больш таго, камп´ютарызацыя навучання дазваляе весці выкладанне гісторыі на сучасным узроўні гістарычнай навукі. Распрацоўка камп´ютарных праграм узбагачае веды і самога выкладчыка. Ён глыбей вывучае тэму, праблему, існуючыя пункты гледжання на яе.

Дамовіліся, што ўся праца навукоўцаў і метадыстаў павінна быць сарыентавана і праводзіцца з улікам пераходу гістарычнай адукацыі на шматузроўневую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў, гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі, аб´яднанні намаганняў гістарычных кафедр ВНУ пры прыярытэце кафедр гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

На заключным пасяджэнні кангрэса прыняты зварот да гісторыкаў рэспублікі і зварот да беларускага народа з нагоды 75-годдзя ўтварэння БНР. Вырашана ў бліжэйшы час уключыць у вучэбныя планы курс «Гісторыя і культура малых народаў Беларусі», правесці навучальныя канферэнцыі, прысвечаныя этнагенезу беларусаў, рэлігіі і царкве, гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, арміі Краёвай і яе ролі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, міжкафедральны калоквіум па праблемах Расійскай гісторыі і інш., выдаць новы падручнік па гістарыяграфіі Беларусі ў двух частках. Вырашылі праводзіць усебеларускія кангрэсы гісторыкаў кожныя пяць гадоў.

Створана асацыяцыя гісторыкаў Беларусі, выбраны яе кіруючыя органы. У склад рады асацыяцыі гісторыкаў абраны прафесары І. П. Крэнь і В. М. Чарапіца, дацэнт Д. У. Караў.

**І. КРЭНЬ,**
**прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі.**

# *Калі адсутнічае парадак*

Стабільнасць вучэбных заняткаў ва універсітэце (арганізацыя, змест, метадычны ўзровень) прама залежыць ад якасці вучэбна-метадычнай дакументацыі, якая распрацоўваецца на кафедрах і факультэтах. Гэта агульнавядома. Па рэкамендацыі рэктарата інспектарская група вывучыла якасць яе распрацоўкі на факультэтах фізічнай культуры, правазнаўства, біялогіі, педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

Як гэта не здаецца дзіўным, у нашым універсітэце да апошняга часу няма адзінага разумення таго, што лічыць, напрыклад, вучэбным планам курса, рабочай праграмай, тэматыкай лекцый і практычных заняткаў, метадычнай распрацоўкай і г. д.

Многія выкладчыкі факультэта біялогіі, педагогікі і методыкі пачатковага навучання складаюць тэматыку лекцыйных і практычных заняткаў, а не рабочую праграму, некаторыя зусім не ўказваюць літаратуру.

Пры складанні вучэбна-метадычнай дакументацыі на ўсіх кафедрах непазбежна ўзнікаюць унутрыпрадметныя і міждысцыплінарныя сувязі. Так, курсы анатоміі і фізіялогіі чалавека адпаведная кафедра біяфака забяспечвае на сваім факультэце, на факультэтах фізічнай культуры, педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Па сутнасці, гэта — розныя вучэбныя курсы, хаця і маюць агульную назву і, безумоўна, міжпрадметныя сувязі своеасаблівыя.

Да таго ж гэтыя курсы, але ўжо з іншай задачай, на факультэце МіМПН вядзе кафедра медыцынскай падрыхтоўкі. І тут не варта дапускаць дубліравання, накладак. Прыкладна тое ж самае можна сказаць пра міжпрадметныя сувязі паміж філасофіяй, вывучэннем моў, гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь і сусветнай культуры.

З вучэбнай дакументацыі асаблівую заклапочанасць выклікаюць вучэбныя планы факультэтаў. Нельга не заўважыць, што на ўсіх факультэтах яны не стабільныя, да таго ж — перагружаны абавязковымі заняткамі. Цыклы вучэбных прадметаў па спецыяльнасці не заўсёды сбалансаваны і не маюць навукова-дыдактычнага абгрунтавання.

Гэтыя і іншыя пытанні зацікаўлена і востра абмяркоўваліся на пасяджэнні інспектарскай групы універсітэта. На ім былі зроблены некаторыя рэкамендацыі па ўдасканаленню вучэбна-метадычнай дакументацыі ва ўніверсітэце:

**— рэкамендаваць вучэбнаму аддзелу правесці кампетэнтную навуковую экспертызу вучэбных планаў на ўсіх факультэтах;**

**— вучэбна-метадычнаму аддзелу распрацаваць абгрунтаваныя адзіныя патрабаванні да розных відаў вучэбнай дакументацыі;**

**— на ўсіх кафедрах распрацаваць міжпрадметныя сувязі па сваіх вучэбных прадметах;**

**— на факультэтах распрацаваць праграму практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй.**

**І. ПРАКОП´ЕЎ,**
**намеснік старшыні інспектарскай групы, дацэнт.**

## Юрыдычная кансультацыя

# Уласнасць, дзяржава і ВНУ

Павелічэнне колькасці суб´ектаў гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці ва ўмовах адставання ў фарміраванні неабходнай нарматыўна-прававой базы суправаджаецца ростам парушэнняў фінансавай дысцыпліны, гаспадарчых і службовых злачынстваў. Работнікамі многіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый нездавальняюча арганізаваны ўлік і захаванасць грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцяў, не захоўваюцца патрабаванні падаткавага заканадаўства. Усё гэта дэстабілізуе сацыяльную і эканамічную сітуацыю ў рэспубліцы.

З мэтай павышэння адказнасці кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і органаў дзяржаўнага кіравання за супрацьпраўную дзейнасць, а таксама эфектыўнага рэгулявання і кантралявання дзейнасці суб´ектаў гаспадарання 25 лістапада 1992 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову № 711 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнаму рэгуляванню і кантраляванню дзейнасці суб´ектаў гаспадарання».

Міністэрствы, ведамствы, іншыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага і мясцовага кіравання павінны выйсці з ліку заснавальнікаў камерцыйных банкаў і прадпрыемстваў, якія займаюцца пасрэдніцкай і гандлёва-закупачнай дзейнасцю, за выключэннем спецыяльна створаных для гэтых мэт. Што датычыць дзяржаўных прадпрыемстваў, то яны абавязаны ў тыднёвы тэрмін з даты прыняцця рашэння аб заснаванні суб´екта гаспадарання паведамляць у адпаведныя органы па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю звесткі аб складзе і памерах укладу ў статутныя фонды гэтага суб´екта.

Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь для забеспячэння кантролю за выкарыстаннем дзяржаўнай маёмасці суб´ектамі гаспадарання, адным з заснавальнікаў (удзельнікаў) якіх з´яўляюцца навучальныя ўстановы, у тым ліку ў ВНУ, створана рабочая група пад кіраўніцтвам намесніка міністра А. У. Казуліна.

З мэтай рэалізацыі названай пастановы ўсе МП, адным з заснавальнікаў якіх з´яўляецца ГрДзУ імя Я. Купалы, павінны прайсці да 1 сакавіка 1993 г. перарэгістрацыю з паведамленнем аб гэтым Міністэрства адукацыі. У выпадку, калі ўказаныя суб´екты гаспадарання ва ўстаноўлены тэрмін не пройдуць яе, іх дзейнасць забараняецца, а даходы, атрыманыя ад дзейнасці, спаганяюцца праз гаспадарчы суд і накіроўваюцца ў мясцовы бюджэт.

Указаннем Міністэрства адукацыі № 143 ад 28.12.1992 г. рэктары ВНУ пры заснаванні (перарэгістрацыі) суб´ектаў гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці абавязаны прадстаўляць у міністэрства для ўзгаднення ўстаноўчыя дагаворы і статуты гэтых суб´ектаў.

Пастановай СМ РБ № 711 от 27.11.92 г. забаронена служачым дзяржаўнага апарату, выканкомаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, кіраўнікам, іх намеснікам і галоўным спецыялістам дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый:

займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, акрамя асобай формы прадпрымальніцтва, ажыццяўляемага кіраўнікамі дзяржаўных прадпрыемстваў на аснове кантракта;

аказваць любое непрадугледжанае законам садзейнічанне фізічным і юрыдычным асобам у прадпрымальніцкай дзейнасці з выкарыстаннем свайго службовага становішча і атрымліваць за гэта ўзнагароджанне, паслугі і ільготы;

выконваць іншую аплачваемую работу на ўмовах сумяшчальніцтва, акрамя навуковай і выкладчыцкай дзейнасці;

без узгаднення з вышэйстаячым органам кіравання самастойна або праз прадстаўніка прымаць удзел у кіраванні акцыянернымі таварыствамі, таварыствамі з абмежаванай адказнасцю або іншымі суб´ектамі гаспадарання.

За парушэнне ўказаных патрабаванняў гэтыя асобы ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам прыцягваюцца да адказнасці аж да вызвалення ад займаемай пасады.

**А. БЕЛАВУСАЎ,**
**начальнік аддзела міжнародных сувязяў, маркетынгу і права.**

## *Навукова-даследчая творчасць студэнтаў*

# 1812 год і Беларусь

**Пад такой назвай прайшла на другім курсе гістарычнага факультэта вучэбная канферэнцыя. Успомніць падзеі 1812 года трэба было не толькі з нагоды 180-годдзя Айчыннай вайны. Гэта наша гістарычная памяць. Хочам мы гэтага сёння ці не, але сам беларускі народ, як частка насельніцтва Расійскай імперыі, лічыў вайну 1812 года айчыннай і бараніў сваю хату, сям´ю, Радзіму. Сённяшнія спрэчкі ў газетах «Звязда», «Чырвоная змена» і іншых выданнях (дарэчы, аўтары ў асноўным не гісторыкі) аб тым, ці была вайна 1812 года для беларусаў айчыннай, мне здаюцца больш палітычнымі, а не гістарычнымі. Няхай чытач сам разбярэцца, прачытаўшы некаторыя матэрыялы на гэтай старонцы.**

**Усяго на канферэнцыі было заслухана восем дакладаў: «Польская карта Напалеона» (М. Фядосава), «Французскі акупацыйны рэжым у Беларусі» (У. Яскулд), «Літоўскі часовы ўрад» (Т. Аўдзейчык), «Гродна ў 1812 г.» (І. Засецкая), «С. М. Ланскі — герой 1812 г.» (С. Зайко), «Д. Давыдаў — вызваліцель Гродна ад французаў» (В. Ільіна, В. Сабалеўская), «Ці была Айчыннай вайна 1812 г. для беларусаў» (Н. Жук), «Беларусы ў рускіх і напалеонаўскіх войсках» (А. Сяргейка).**

**Супрацоўнікі бібліятэкі К. П. Жураўлёва і Г. М. Бырда пыдрыхтавалі да канферэнцыі выставу кніг «1812. Вялікі год Расіі», што дазволіла студэнтам бліжэй пазнаёміцца з публікацыямі па тэматыцы канферэнцыі.**

**В. ШВЕД,**
**дацэнт кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў.**

## *Гродна ў 1812 годзе*

На вялізнай тэрыторыі Гродзенскай губерні напярэдадні напалеонаўскага нашэсця былі сканцэнтраваны вялікія ваенныя сілы. Невыпадкова 5 мая 1812 года Аляксандр I некалькі гадзін прабыў у Гродне. Губерня мела стратэгічнае становішча, адсюль вывозіліся хлеб і жывёла для арміі. У чэрвені 1812 г. цар загадаў гродзенскаму губернатару Ланскому вывесці з горада ў Пскоў усе каштоўнасці і дакументы. 4 чэрвеня ў сакрэтным рапарце Літоўскаму ваеннаму губернатару Ланскі паведамляў аб мерах, што прыняты па перавозцы архіваў з Гродна і Брэста, медыкаментаў на некалькі соцень тысяч рублёў з казённай ваеннай аптэкі, наяўных грошай, рызы і іншай каштоўнасці з цэркваў.

Вырашыўшы ваяваць з Расіяй, Напалеон разгарнуў дзейнасць тайнай разведкі. Пры сваім штабе ён сфарміраваў асобае разведвальнае бюро. Агенты вербаваліся з розных пластоў насельніцтва — ад лакеяў да чыноўнікаў.

Ноччу 12 (24) чэрвеня 1812 г. без абвяшчэння вайны армія Напалеона пачала пераправу праз Нёман. На Гродзеншчыне павінен быў па задуме Напалеона вырашыцца лёс ваеннага і палітычнага прэстыжу Францыі. Разбіўшы Баграціёна, Напалеон планаваў спыніцца ў Смаленску і Мінску і зазімаваць у Літве.

У напрамку Гродна дзейнічала правае крыло войск Напалеона ў складзе трох пяхотных і аднаго кавалерыйскага корпусу пад камандаваннем брата Напалеона Жарома Банапарта. Пад націскам удвая большых сіл праціўніка армія Напалеона пачала адступаць за межы Гродзенскай губерні, каб аб´яднацца з іншымі рускімі войскамі. Яна рухалася праз Гродна і выходзіла на дарогу Гродна-Ваўкавыск. Па пятах ішла 75-тысячная армія Жарома Банапарта. Размешчаны ў Гродне корпус генерала Платава павінен быў ахоўваць пераправу праз Нёман, затрымаць наступленне французаў і даць магчымасць эвакуіраваць горад. Платаў загадаў гродзенкаму паліцмейстару Высочыну знішчыць мост праз Нёман. Спробы паўбатальёна ўнутранай аховы пад камандаваннем прапаршчыка Пушына затрымаць французаў былі няўдалыя, а сам Пушын быў забіты. Атрад Платава адступіў праз Бераставіцу, Шчучын, Ліду. Разам з ім эвакуіраваліся жыхары горада, губернатар, чыноўнікі, архівы.

10 (30) чэрвеня 1812 года ў Гродна ўвайшоў Банапарт, які павінен быў дзейнічаць супраць 2-й арміі Баграціёна з тылу, але ў Гродне ён прабыў 5 сутак і тым самым страціў магчымасць навязаць Баграціёну бітву.

З падзеннем Гродна была завершана Нёман-Віленская аперацыя французскага камандавання, але асноўны план Напалеона — знішчыць армію Баграціёна — выкананы не быў.

Адступленне рускіх войск суправаджалася суровымі сутычкамі з непрыяцелем пад Кобрынам, Мірам, Гарадзечна. У першай буйной бітве войск генерала Платава з французамі ля мястэчка Мір вызначылася «кавалерыст-дзяўчына» Надзея Андрэеўна Дурава — першая ў Расіі жанчына-афіцэр.

Захапіўшы Гродзенскую губерню, французы ўстанавілі тут сваё праўленне. У Гродне была арганізавана адміністрацыйная камісія, а ва ўездах — прадпрэфектуры, якія павінны былі дастаўляць арміі Напалеона, па словах французскага маршала Даву, прадукты.

19 ліпеня быў утвораны Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага, якое складалася з Віленскай, Мінскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці.

Гарадское (муніцыпальнае) ўпраўленне складалася з 4 аддзяленняў: паліцэйскага, фінансавага і правіянцкага, кватэр-мейстэрскага і богаўгодных спраў. Узначальваў гарадское ўпраўленне мэр горада, пасаду якога з першых дзён акупацыі займаў памешчык Мучынскі, «яснавяльможны шляхціч, жыхар Гродна, дэпутат двух сеймаў».

Насельніцтва Гродна, як і ўсёй губерні павінна было плаціць шмат падаткаў: падаходны ў памеры 1/7 часткі атрымліваемага даходу; на напіткі (нават на воцат); на жывёлу, мяса, масла, тытунь і іншае. Акрамя таго, выконваць розныя работы — падводную, забяспечваць армію фуражом і харчамі і г. д.

Вялікіх намаганняў насельніцтву каштавала забеспячэнне напалеонаўскай арміі прадуктамі харчавання. 22 ліпеня ў Гродне быў адкрыты магазін на 500 тысяч порцый хлеба, ялавічыны, гарэлкі і зеляніны. Французы абакралі іезуіцкі касцёл, Сафійскі праваслаўны сабор перагварылі ў склад сена і аўса. За 5 месяцаў акупацыі насельніцтва губерні было настолькі даведзена да галечы, што 1 снежня 1812 года Часовае праўленне спецыяльнай пастановай загадала мясцовым уладам шостую частку ўкрадзенай маёмасці прыняць у кошт падаткаў.

Агульныя страты, нанесеныя вайной 1812 года насельніцтву Гродзенскай губерні, па афіцыйных дадзеных, ацэньваліся ў 32,5 мільёна рублёў, было забіта 4 тысячы мірных грамадзян, знішчана 650 дамоў.

Насельніцтва губерні варожа сустрэла акупантаў. Сяляне ішлі ў лясы, аказвалі дапамогу рускай арміі, за што многія жыхары Гродзеншчыны ўдастоіліся падзяк ад рускага камандавання. Так, Кутузаў і Баграціён ўзнагародзілі за садзейнічанне арміі чыноўнікаў Бумарына і Швыкоўскага. Падзяку генерала Дахтурава атрымалі настаўнікі і вучні Свіслацкай гімназіі. На тэрыторыі губерні дзейнічаў партызанскі атрад былога ляснічага І. Парадоўскага. Партызаны трымалі сувязь з рускай арміяй і забяспечвалі яе звесткамі аб праціўніку. 8 жніўня атрад перахапіў кур´ераў, якія спяшаліся з Магдэбурга ў Гродна з ваеннымі дакументамі. Гэтыя дакументы былі затым дастаўлены рускім генералам Войнаву і Дахтураву, а І. Парадоўскі прадстаўлены да ўзнагароды.

Планамі Кутузава вызваленне Гродна ўскладвалася на генерала-ад´ютанта Ажароўскага, які рухаўся на Гродна з боку Ліды. У выпадку, калі б атрад Ажароўскага затрымаўся каля Ліды, партызанскія часці Д. Давыдава павінны былі прыйсці на дапамогу. Ажароўскі падыйшоў да горада ў канцы лістапада. У гэты час там знаходзіўся тысячны атрад аўстрыйскіх войск генерала Фрэйліха. На прапанову здацца той адказаў адмоўна. Але хутка да горада падыйшлі часці Давыдава, і авангардны полк палкоўніка Чачэнскага здолеў пераканаць Фрэйліха пакінуць горад, не знішчаючы правіянту і ваенных запасаў. 9 снежня 1812 года ў горад уступіў Д. Давыдаў.

Аднак становішча ў горадзе заставалася напружаным. Прызнаўшы начальнікам горада палкоўніка Храпавіцкага, Д. Давыдаў выдаў распараджэнне жыхарам на працягу двух гадзін здаць усю зброю. Былі складзены спісы тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі. Мясцовым дваранам прадпісвалася забяспечваць атрад Давыдава правіянтам і фуражом. 13—14 снежня 1812 г. рэшткі французскіх войск былі выгнаны з усёй Гродзенскай губерні.

**Ірына ЗАСЕЦКАЯ.**

# Беларусы ў арміях Расіі і Напалеона

Пытанне «Беларусь і Айчынная вайна 1812 года» дастаткова шматграннае, бо няма яснасці ў вызначэнні адносін да Напалеона рускага і беларускага народаў. Перад знешняй небяспекай рускі народ — ад царскага двара да самага беднага селяніна — быў аднадушны ў непрыняцці няпрошаных гасцей... У Беларусі і Літве значная частка дваранства і духавенства спачатку вітала Напалеона, ад якога атрымала згоду на аднаўленне былога Вялікага княства Літоўскага. Беларускія палкі былі і ў Расійскай і напалеонаўскай арміях. Тлумачылася гэта пэўнымі гістарычнымі прычынамі.

У арміі Напалеона, акрамя саксонцаў, прусакоў, галандцаў, аўстрыйцаў, італьянцаў і інш., змагаліся палякі і частка беларускага дваранства. З іх быў сфарміраваны пяты корпус, на чале якога стаў пляменнік апошняга караля Рэчы Паспалітай князь Юзэф Панятоўскі. Гэты чалавек, якога ў Еўропе называлі «польскі Баярд» і які заваяваў велізарную папулярнасць у суайчыннікаў, перарастаўшую ў культ асобы, без хістанняў стаў на бок Напалеона. У корпус Панятоўскага ўваходзілі дывізіі Заёнчыка, Дамброўскага і Князевіча, усяго 36 400 чалавек. Акрамя таго, у складзе французскіх войск дзейнічаў шляхецкі кавалерыйскі полк генерала Канопкі, асобны шляхецкі эскадрон, эскадрон так званай шляхты — мусульман-беларускіх татар пад камандаваннем Ахматовіча, конна-егерскі полк Ігната Манюшкі і іншыя падраздзяленні, якія складваліся пераважна з мясцовай шляхты Гродзенскай і часткова Мінскай губерні.

Цяпер аб прычынах.

Уз´яднанне Беларусі з Расіяй адбылося ў выніку падзелу Рэчы Паспалітай, а таксама Цільзіцкага міру, пасля якога да Расіі перайшла ад Прусіі Беластоцкая акруга са значнай колькасцю беларускага насельніцтва. У гэты час у Беларусі пражывала 4 мільёны чалавек (1/9 часткі насельніцтва Расіі). Змянілася становішча сялян. За 1772—1800 гг. рускім памешчыкам было аддадзена ў карыстанне 208 550 душ мужчынскага полу. Улічваючы іх жонак і дзяцей, гэта складала больш як мільён чалавек. Тысячы людзей падвергліся рэпрэсіям, напрыклад, салдаты былой арміі ВКЛ, якая была распушчана (гэта каля 30 тысяч чалавек). Цяжкімі былі і ўстаноўленыя падаткі.

Недальнабачная палітыка царызму ўскладніла сітуацыю і рыхтавала глебу для незадавальнення, сеяла недавер паміж беларусамі і рускімі. Былі ўведзены рэкруцкія наборы, якіх раней Беларусь не ведала. З беларускіх і літоўскіх ураджэнцаў былі створаны палкі: конны літоўскі, конны татарскі і конны польскі (этнічная тэрыторыя Польшчы ў той час не ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі). Кожны полк меў тысячны склад — 500 чалавек шляхты і 500 радавых (шараговых).

У 1807 годзе ад рэкруцкіх набораў была вызвалена Украіна, затым Латвія, Эстонія, Бессарабія. Вызваляліся таксама яўрэі, сем´і духавенства і ганаровых грамадзян, каланісты. Такім чынам, рэгулярная армія Расіі камплектавалася галоўным чынам з рускіх і беларусаў. Гэтаму садзейнічала і сходнасць моў і веравызнання.

У адрозненне ад занятых рускіх абласцей і Латвіі, дзе дзейнічала акупацыйная адміністрацыя, Беларусь і Літва лічыліся Напалеонам «вызваленымі ад рускага ярма». У Вільні на трэці дзень пасля ўступлення ў горад французскіх войск са згоды імператара ўтварылася Камісія часовага ўрада ВКЛ, якая прысягнула Напалеону. Ад яе патрабавалася адно: пастаўкі фуражу, прадуктаў, грошай і ваенных падраздзяленняў (не менш як 100 тысяч чалавек).

З дваранскай студэнцкай моладзі быў створаны лёгкаконны полк пад камандаваннем ураджэнца Слоніма генерала Канопкі. Гэты полк Напалеон залічыў да імператарскай гвардыі і пакінуў у Беларусі для дзеянняў супраць арміі Тормасава.

Акрамя таго, з беларусаў і літоўцаў была створана артылерыйская батарэя, якая ўвайшла ў корпус Панятоўскага, а да палку Канопкі далучыўся эскадрон беларускіх татар пад камандаваннем Ахматовіча. У ліку беларуска-літоўскіх падраздзяленняў, што знаходзіліся ў Напалеона, быў і трохтысячны полк уланаў, сфарміраваны Радзівілам.

Невялікім энтузіязмам у адносінах да Напалеона вызначалася і беларуская шляхта, мяшчанства. Спачатку яны спрабавалі падтрымаць французаў, але пасля паражэння польскіх уланаў і французаў пад Мірам і саксонцаў пад Кобрынам іх запал зменшыўся. Шляхта з помпай адзначала 15 жніўня дзень нараджэння Напалеона. Але ўсё гэта мала падмацоўвалася справамі. З 23-тысячнай арміі, створанай у Беларусі, у баявых дзеяннях прыняло ўдзел менш чвэрці.

Лёс многіх людзей склаўся драматычна. Гвардзейскі полк генерала Канопкі ў баі пад Слонімам страціў 230 чалавек, астатнія ўцяклі ў Навагрудак і пазней далучыліся да іншых беларускіх часцей, што пакінулі Радзіму разам з французамі. 22-і пяхотны і 18-ы уланскі палкі былі разбіты пад Мінскам войскамі 3-й арміі. Іншыя пяхотныя палкі адступілі ў Польшчу. У цэлым, большасць беларускіх салдат, прызваных магнацкай вярхушкай на службу да Напалеона, ваявалі і гінулі зусім бязмэтава — за чужыя інтарэсы і на чужой зямлі.

**Алена СЯРГЕЙКА.**

# С. М. Ланскі — наш зямляк

Герояў вайны 1812 года ведаюць, бадай, усе... Кутузаў, Барклай дэ Толі, Баграціён, Платаў, Давыдаў. Але сёння мала хто прыпомніць, што сярод актыўных змагароў было нямала ўраджэнцаў Беларусі. Адным з іх быў С. М. Ланскі. Звесткі пра яго вельмі скупыя. Пахаваны ён у нашым горадзе на праваслаўных могілках.

Хто ж такі С. М. Ланскі? Па гістарычных матэрыялах «Ваеннай галярэі 1812 года», выдадзенай у Санкт-Пецярбурзе ў 1912 годзе і Рускага біяграфічнага слоўніка ўстаноўлена, што С. М. Ланскі нарадзіўся ў 1779 годзе. (Але ў Ваеннай энцыклапедыі, выдадзенай у 1914 г., сказана, што ён нарадзіўся ў 1774 г.). Па некаторых дадзеных, Ланскі з´яўляецца ўраджэнцам Навагрудскага павета Гродзенскай губерні. Атрымаў хатняе выхаванне, быў яшчэ малым запісаны ў лейб-гвардыі Ізмайлаўскі полк. Службу пачаў у 14 год у чыне прапаршчыка, а ў 1800 г. быў ужо штабс-капітанам. З гэтага часу ён пераходзіць у кавалерыю і праслужыў з адным перапынкам да апошняга дня жыцця. Перапынак гэты быў звязаны з пераводам яго ў 1802 годзе ў калегію замежных спраў і з пасылкай з дыпламатычнай місіяй у Парыж. Але ўжо ў жніўні 1805 г. ён вярнуўся на ваенную службу, як палкоўнік Марыупальскага палка і прымае ўдзел у вайне 1805—1807 г.г. У ноч на 26 студзеня 1807 г. яго полк вёў бой пад Ландсбергам, а праз два дні — пад Прэйсіш-Эйлаў.

У маі 1807 г. яго назначаюць камандзірам Коннапольскага палка (раней стаяў у Гродне), які знаходзіўся на мяжы з Усходняй Прусіяй. С. Ланскі атрымаў Георгіеўскі афіцэрскі крыж, а ў 1810 г. становіцца генерал-маёрам. 3 жніўня 1810 г. С. М. Ланскі быў назначаны шэфам Беларускага гусарскага палка, сфарміраванага ў 1803 г. у асноўным з ураджэнцаў беларускіх губерняў.

У пачатку Айчыннай вайны полк стаяў на левым фронце 1-й Заходняй арміі Барклая дэ Толі, недалёка ад Гродна. Разам з войскамі корпуса Вітгенштэйна полк прыкрываў адыход арміі да Заходняй Дзвіны, а затым — у прыкрыцці дарогі на Пецярбург.

У пачатку снежня кавалерысты Ланскога разам з партызанскім атрадам Сяслевіна смелымі атакамі вызвалілі Вільню. 1 студзеня 1813 г. галоўныя сілы рускай арміі пад кіраўніцтвам Кутузава перайшлі дзяржаўную мяжу. Авангардам камандаваў генерал Ф. Ф. Вінценгеродзе, наперадзе якога ішоў асобы атрад Ланскога. Пасля вызвалення Гродна ў яго ўвайшоў атрад Дзяніса Давыдава. Апошні ў сваіх ваенных запісах так сказаў пра Ланскога: «Столь же красивый наружностью, столь блистательный мужеством».

У пачатку лютага атрад Ланскога авалодаў горадам Калішам (Польшча), за што быў узнагароджаны ордэнам святога Уладзіміра 2-й ступені.

У лістападзе 1813 г. Ланскі стаў генерал-лейтэнантам. Ён прымаў удзел у грандыёзнай «бітве народаў» пад Лейпцыгам 16—19 кастрычніка 1813 года, якая закончылася паражэннем французаў. Саюзныя войскі выйшлі да межаў Францыі, а затым перайшлі іх. Французы супраціўляліся яшчэ вельмі ўпарта.

Апошняй для Ланскага была бітва пад Краонам 23 лютага (7 сакавіка) 1814 года. Каля гэтага невялічкага гарадка ў Шампані рускія войскі стойка трымаліся да 2 гадзін дня супраць тройчы мацнейшых войск праціўніка, якімі кіраваў сам Напалеон. Тады Ланскі быў цяжка паранены, а затым праз тры тыдні памёр. За баявыя заслугі Ланскі быў узнагароджаны ордэнамі святой Ганны 2-га класа, Георгія 3-га і 4-га класаў, залатой шабляй «За храбрасць». Генерал вызначаўся дробрымі адносінамі да салдат. Таварышы перавезлі цела ў Гродна і пахавалі тут. Можа таму, што ён нарадзіўся ў Навагрудскім павеце, а можа таму, што з 1803 г.г. па 1813 год губернатарам у Гродне быў Васіль Сяргеевіч Ланскі (магчыма родзіч), ці проста пахавалі ў першым прыгранічным горадзе.

**Святлана ЗАЙКО.**

